WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

2 ВЕРАСНЯ 2010 г.
ЧАЦВЕР
№ 171
(26779)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.



Фота БЕЛТА.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

## «Галоўнай задачай у Беларусі заўсёды будзе клопат аб кожным чалавеку, дарослы гэта або дзіця»

**Галоўнай задачай у палітыцы Беларусі заўсёды быў, ёсць і будзе клопат аб кожным чалавеку, дарослы гэта або дзіця. Аб гэтым заявіў учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, адкрываючы новую школу ў вёсцы Бараўляны Мінскага раёна, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

«Якія б цяжкасці мы ні перажывалі, галоўнай тэмай парадку дня ў палітыцы Беларусі заўсёды быў, ёсць і будзе клопат аб кожным чалавеку, маленькім, вялікім, дзіцяці, дарослым, — гэта наша палітыка», — сказаў Прэзідэнт.

«У свеце ёсць нямала розных крытэрыяў вызначэння ўзроўню развіцця і дабрабыту дзяржаў. Але сапраўднае шчасце, пагадзіцеся, залежыць ад простых і вечных каштоўнасцяў — здароўя, любімай сям'і, утульнага дома, магчымасці атрымаць добрую адукацыю і мець дастойную работу. І для мяне як Прэзідэнта важны стан менавіта гэтых паказчыкаў, а не якіх-небудзь іншых лічбаў», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў добрую тэндэнцыю павелічэння колькасці сем'яў і нараджальнасці, што ў сваю чаргу абумоўлівае развіццё эканомікі, жыллёвага будаўніцтва, стварэння новых рабочых месцаў. «Інакш кажучы, Беларусь расце, маладзее і ўпэўнена глядзіць у будучае», — сказаў ён. «Упэўнены, калі б па гэтым крытэрыі ацэньваліся дзяржавы, то наша краіна магла б прэтэндаваць на самы высокі рэйтынг у свеце», — лічыць кіраўнік дзяржавы.

Паводле яго слоў, ужо стала добрай традыцыяй 1 верасня адкрываць новыя школы. Гэты Дзень ведаў стаў днём нараджэння адразу для чатырох новых школ. На думку Прэзідэнта, у школы ў Бараўлянах самы цікавы лёс. Марай аб новай школе з кіраўніком дзяржавы ў канцы 2007 года падзяліліся маці і выхаванцы Бараўлянскай дзіцячай вёскі. Дзеці з гэтага і навакольных населеных пунктаў вымушаны былі цясніцца ў навучальных установах суседняга пасёлка Лясны. «Я сваё абяцанне выканаў, цяпер справа за вамі, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Галоўнае, каб школа стала цэнтрам падрыхтоўкі разумных, прыгожых, таленавітых і моцных дзяцей, адданых нашай краіне. Нам гэта вельмі патрэбна. Па такім шляху мы і будзем рухацца».

Гэты год для некаторых дзяцей стане памятным удвая, бо яны не толькі атрымалі ў падарунак новую школу, але і, нарэшце, знайшлі сям'ю і ўласны дом у дзіцячай вёсцы «Вытокі», сказаў Прэзідэнт. «Для нас няма чужых дзяцей. Дзяржава адказвае за іх лёс, і мы разам павінны зрабіць усё неабходнае, каб кожнае наша дзіця знайшло сваю сям'ю», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Звяртаючыся да дзяцей, Аляксандр Лукашэнка заклікаў берагчы іх новы школьны дом, а настаўнікам майстэрствам, захопленасцю сваім прадметам і любоўю да дзяцей знайсці шлях да сэрца кожнага дзіцяці, прабудзіць у вучнях прагу да пазнання.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка яшчэ ў 2007 годзе пры наведванні «SOS-Дзіцячай вёскі» ў Бараўлянах паведаміў, што ў краіне разгорнута праграма па перасяленні дзяцей-сірот з дамоў-інтэрнатаў у сем'і, дамы, дзіцячыя вёскі, у аснове якіх сямейны падыход да апекі дзяцей. Калі ў 2007 годзе ў Беларусі была 71 сіроцкая ўстанова ў сістэме адукацыі, то цяпер іх засталося 57 — на 20 працэнтаў менш. Колькасць дзяцей, якія выхоўваюцца ў іх, за два гады скарацілася на 25 працэнтаў. На думку спецыялістаў Мінадукацыі, гэта вельмі добры паказчык.

СТАР. 2

## ПЕРШАВЕРАСНЁЎСКІЯ ПАЧУЦЦІ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Таццяна ПАСТУХОВА і Іна ШЫПЁНАК разам з аднакурснікамі радуюцца першавераснёўскай сустрэчы і пачатку новага навучальнага года. Будучыя інжынеры-металургі ўжо трэццякурснікі механіка-тэхналагічнага факультэта Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта.**

Працяг тэмы

## ЧАРГОВЫ ТЭРМІН ДЛЯ ШМАТПАКУТНАГА ДОМА

**Трэці раз вяртаюся да тэмы будаўніцтва дома для шматдзетнай сям'і гомельскага праваслаўнага свяшчэнніка Уладзіміра Драбышэўскага. Ён, у адпаведнасці з Указам Прэзідэнта № 185 «Аб прадастаўленні грамадзянам ільготных крэдытаў на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылых памяшканняў», з канца 2007 года будуе ў Гомелі дом для сваіх пяцярых дзяцей. Вось-вось і шосты павінен нарадзіцца. Мне давялося пабываць на нарадзе ў Гомельскім гарвыканкаме, прысвечанай вырашэнню жыллёвай праблемы гэтай шматдзетнай сям'і. І яшчэ раз пераканацца: выратаванне тых, хто тоне, у першую чаргу справа іх саміх. Чыноўнікі высокага рангу забыліся на тое, што прэцэдэнт быў створаны ці імі, ці іх папярэднікамі некалькі год таму, калі на падставе загружанасці ўсіх спецыялістаў упраўленне капітальнага будаўніцтва катэгарычна адмовілася будаваць дом для канкрэтнай сям'і. Калі б не было тагачаснага «хацелася як лепш», не атрымалася б сённяшняга «як заўсёды».**

Даволі падрабязна сітуацыя была расказана ў двух артыкулах (Дом «на халяву» 30.09.2009 і «Усіх трэба зразумець?» 28.08.2010), і вось — афіцыйны ліст-рэагаванне. У ім — папрок заказчыку Драбышэўскай М.А. (жонцы айца Уладзіміра) у тым, што «прыняць аб'ект незавершанага будаўніцтва на баланс УКП «УКБ Гомельскага гарвыканкама» не ўяўлялася магчымым па прычыне грубага парушэння гр. Драбышэўскай М.А. як заказчыкам тэхнічных нарматыўных прававых актаў пры арганізацыі і вытворчасці работ, вядзення выканаўчай дакументацыі». Яшчэ адно ўпіканне было агучана ў Гомельскім гарвыканкаме старшынёй Віктарам Піліпцом, ускосна і ў мой бок: «Не трэба вадзіць за сабой журналістаў, каб вырашыць праблему». Ён у мяне таксама пацікавіўся, ці не сваячаніца я Драбышэўскім.

СТАР. 3

## У БЕЛАРУСІ З 1 ВЕРАСНЯ ПАВЫШАНА ЗАРПЛАТА АСОБНЫМ КАТЭГОРЫЯМ БЮДЖЭТНІКАЎ

**Такое рашэнне змяшчаецца ў пастанове Савета Міністраў № 1267 ад 1 верасня 2010 года, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў Апараце Савета Міністраў.**

Рашэнне прынята ў мэтах далейшага павышэння зарплаты асобным катэгорыям работнікаў бюджэтных арганізацый і іншых арганізацый, што атрымліваюць субсідыі, работнікі якіх прыраўнаваны па аплаце працы да работнікаў бюджэтных арганізацый.

Устаноўлены карэктуючыя каэфіцыенты да разлічаных па Адзінай тарыфнай сетцы работнікаў Беларусі тарыфных ставак (акладаў) работнікаў, якія тарыфікуюцца 1-27 разрадамі, у памерах 2,862 — 0,978. Такім чынам, заработная плата нізкааплатных катэгорый работнікаў павысіцца за кошт змянення карэктуючых каэфіцыентаў.

У адпаведнасці з пастановай урада на 10 працэнтаў павышаны тарыфныя аклады (стаўкі) маладым спецыялістам, якія атрымалі вышэйшую і сярэднюю спецыяльную адукацыю за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў або на ўмовах аплаты, накіраваным на работу па размеркаванні ў бюджэтныя арганізацыі.

На 25 працэнтаў павышаны тарыфныя аклады (стаўкі) педагагічным работнікам бюджэтных арганізацый, за выключэннем прафесарска-выкладчыцкага складу вышэйшых навучальных устаноў і ўстаноў адукацыі (падраздзяленняў устаноў адукацыі), якія забяспечваюць павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўку кадраў.

Таксама на 25 працэнтаў павышаны тарыфныя аклады ўрачам, уключаючы кіраўнікоў, якія працуюць у бюджэтных арганізацыях.

Павышэнне тарыфных акладаў (ставак) работнікам устаноў сацыяльнага абслугоўвання складзе 15 працэнтаў. На такую ж велічыню павысяцца тарыфныя аклады работнікам культурна-асветных устаноў.

Рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання, мясцовым выканаўчым і распарадчым органам, кіраўнікам бюджэтных арганізацый неабходна забяспечыць пераразлік заработнай платы работнікаў у адпаведнасці з новымі карэктуючымі каэфіцыентамі і павышэннямі тарыфных акладаў (ставак).

Мікалай ЛАДУЦЬКА:

## «Цэны на айчынныя агародніну і садавіну расці не павінны»

**Цэны на агародніну і садавіну, якія вырошчваюцца на тэрыторыі Беларусі, у гандлёвай сетцы сталіцы расці не павінны. Як перадае карэспандэнт агенцтва «Мінск—Навіны», пра гэта заявіў на аператыўнай нарадзе ў Мінгарвыканкаме яго старшыня Мікалай Ладуцька.**

Ён адзначыў, што цяпер, калі ідзе нарыхтоўка прадукцыі ў стабілізацыйныя фонды, трэба вельмі дакладна рэагаваць на ўсе ваганні кошту.

— Па агародніннай групе, якая вырабляецца на тэрыторыі Беларусі, ніякага росту цэнаў быць не павінна, — падкрэсліў М. Ладуцька. — Гэта сезонны тавар, на які цэны павінны апускацца, а не павышацца. Сёння ўраджай па рэспубліцы дастаткова ўстойлівы. Для таго каб стабілізацыйныя фонды маглі ўплываць на цэнавую палітыку, будзе ўстаноўлена фіксаваная закупачная цана. Дзякуючы ёй, паводле слоў Мікалая Ладуцькі, прадпрыемствы не выйдуць за цэнавую мяжу, якая задавальняе насельніцтва.

**Наталля ВАВІЛАВА, «Мінск—Навіны».**

## 26 ЧАЛАВЕК ЗАГІНУЛА НА ПАЛЯВАННІ...

**Згодна з той інфармацыяй, што ёсць у Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, колькасць зарэгістраваных няшчасных выпадкаў пры правядзенні паляванняў з 2007 года практычна не зніжаецца і знаходзіцца на высокім узроўні.**

За тры з паловай гады ў краіне зарэгістраваныя 39 няшчасных выпадкаў пры правядзенні паляванняў. У іх 26 чалавек загінула, 13 было паранена.

— Ужо сёння абмяркоўваецца мэтазгоднасць выкарыстання паляўнічымі камізэлек павышанай бачнасці, правядзенне паляванняў толькі ў паляўнічых угоддзях, якія абсталяваныя стралковымі лініямі, а таксама абмежаванні па колькасці паляўнічых на аднаго кіраўніка пры правядзенні загонных паляванняў, паляванняў з засады і з падыходу, — гавораць спецыялісты Дзяржаўнай інспекцыі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ААТ «НАФТАН»: МАДЭРНІЗАЦЫЯ — ШЛЯХ ДА СУСВЕТНАГА ЎЗРОЎНЮ

Да дня работнікаў нафтавай, газавай і паліўнай прамысловасці



**НАГОДАЙ у чарговы раз завітаць на ААТ «Нафтан» паслужыла прафесійнае свята — Дзень нафтавай, газавай і паліўнай прамысловасці. Ды і апошні раз на старонках газеты расказвалі пра калектыў першынца беларускай нафтаперапрацоўкі больш як два гады таму. За гэты час прадпрыемства паспяхова завяршыла першы этап Праграмы рэканструкцыі і мадэрнізацыі і прыступіла да наступнага. Зараз рэалізуюцца 22 буйныя інвестыцыйныя праекты. Будуецца ўстаноўка першаснай перапрацоўкі нафты АТ-8, устаноўка нізкатэмпературнай ізамерызацыі «Пенекс», вакуумны блок устаноўкі «Вісбрэкінг». Распачатыя работы па рэалізацыі праекта будаўніцтва ўстаноўкі запаволенага каксавання. Гэтыя і іншыя новаўвядзенні дазволяць павялічыць магутнасці па першаснай перапрацоўцы нафты да 12 млн тон у год, пры гэтым знізіць выхад топачнага мазуту да 6-8 %. Уся прадукцыя будзе адпавядаць дзейным і нават перспектыўным патрабаванням Еўрасаюза. Таксама на прадпрыемстве істотна знізіцца энергаспажыванне. Як запэўніваюць спецыялісты, па завяршэнні рэалізацыі Праграмы ААТ«Нафтан» выйдзе на ўзровень лепшых сучасных прадпрыемстваў з глыбінёй перапрацоўкі не меней за 92 %.**

**Яшчэ адзін момант, які хвалюе многіх, гэта, як прадпрыемства беларускай «нафтанкі» працуе ў новых няпростых умовах гаспадарання, у якіх апынулася з-за ўвядзення расійскім бокам мытных пошлін на сыравіну.**





Вячаслаў ЯКУШАЎ:

## «АДАПТАЦЫЯ ДА НОВЫХ УМОЎ ГАСПАДАРАННЯ БЫЛА СКЛАДАНАЙ, АЛЕ МЫ СТАЛІ НА НОГІ»

— Апошнім часам намаганні кіраўніцтва, спецыялістаў, усіх працаўнікоў завода былі накіраваныя на адаптацыю да новых коштавых умоў пастаўкі нафты і вуглевадароднай сыравіны ў Рэспубліку Беларусь, забеспячэнне эфектыўнай працы ААТ «Нафтан» у гэтых умовах, — паведаміў **генеральны дырэктар таварыства Вячаслаў ЯКУШАЎ**. — Кажучы шчыра, старт года быў вельмі складаным. Зараз, дзякуючы прынятым рашэнням Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі, Урада, сітуацыя выправілася. Айчынныя НПЗ да канца другога—пачатку трэцяга квартала сталі на ногі.

Гаворка ідзе пра чарговы танкер з венесуэльскім «чорным золатам» для Беларусі. Папярэднія чатыры разгружалі ў Адэсе, затым сыравіну адпраўлялі на Мазырскі НПЗ. Пятая партыя дастаўляецца ў Наваполацк праз эстонскі порт Мууга. Гэты чыгуначны маршрут складае 850 км і на 200 км карацей за ўкраінскі.

Да прыёму сыравіны з Баліварыянскай Рэспублікі мы падрыхтаваліся грунтоўна. Правялі рамонт эстакады па зліве нафты, адрамантавалі рэзервуары. Таксама прадстаўнікі прадпрыемства пабывалі ў калегаў у Мазыры і даследавалі ўзоры «Санта-Барбары» ў сваіх лабараторыях. Якасцю лацінаамерыканскага «чорнага золата» засталіся задаволеныя. Тым больш што мы маем вопыт перапрацоўкі сыравіны аналагічнага фракцыйнага складу.

Першы чыгуначны састаў з венесуэльскай нафтай мы атрымалі 31 ліпеня ў 14.30. Усе 65 вагона-цыстэрнаў былі злітыя ў той жа дзень. Па стане на 30 жніўня мы злілі каля 160 тыс. тон нафты гатунку «Санта-Барбара» і штодня перапрацоўваем прыкладна 6-6,5 тыс. тон у сумесі з расійскай нафтай гатунку URALS. Нафту пастаўляе Беларуская нафтавая кампанія, якая выступае ў якасці давальца сыравіны. Гэта істотная дапамога для завода ў няпросты час. Як вядома, з 1 студзеня 2010 года ўмовы для беларускіх нафтаперапрацоўшчыкаў істотна змяніліся і, на жаль, не ў лепшы бок. Нафта падаражэла практычна ўдвая. Даводзіцца закупляць пэўны аб'ём нафты з мытнай пошлінай. У студзені працавалі толькі з такой нятаннай сыравінай. Набылі яе каля 428 тыс. тон. А цэны на нафтапрадукты ў Беларусі, як вядома, не змяняліся...

***— Уразілі пераўтварэнні, якія за апошнія два гады адбыліся ў сацыяльнай сферы прадпрыемства...***

— Сапраўды, зроблена нямала. Працяглы час на ААТ «Нафтан» сацыяльным пытанням надавалася недастаткова ўвагі. Умовы побыту для завадчан павінны знаходзіцца на належным высокім узроўні. Таму паралельна з праграмай рэканструкцыі і мадэрнізацыі прадпрыемства на 2005—2010 гады, якая зараз перарасла ў праграму «Нафтан» 2010—2015», вяліся работы па рэканструкцыі і ўводзе сацыяльных аб'ектаў, якія калісьці былі пачатыя, але па невядомых прычынах не былі завершаныя.

СТАР. 4, 5

### Паважаныя калегі!

Ад усёй душы віншую вас з Днём нафтавай, газавай і паліўнай прамысловасці. Сярод іншых прафесійных святаў гэты дзень займае асаблівае месца, бо нафтаперапрацоўка з'яўляецца адным з лакаматываў айчыннай эканомікі. Да гэтага свята мы традыцыйна рыхтуем свае працоўныя падарункі і ставім задачы на будучыню. Нягледзячы на няпростую сітуацыю, якая склалася на пачатку года з пастаўкамі нафты і цэнаўтварэннем, акцыянернае таварыства «Нафтан» мабільна перайшло на працу з альтэрнатыўнымі відамі сыравіны, наладзіла тэхналагічны працэс перапрацоўкі новага віду нафты і працягвае павялічваць загрузку магутнасцяў.

Творчы патэнцыял нафтавікоў, высокая арганізаванасць дазваляюць нам у складаных эканамічных умовах знаходзіць шляхі рашэння вытворчых, эканамічных і сацыяльных задач. Мы ўвесь час удасканальваем кадравую палітыку, ствараем новыя працоўныя месцы, надаём вялікую ўвагу стварэнню максімальна камфортных умоў працы, забеспячэнню супрацоўнікаў комплексам гарантый, ільгот і кампенсацый.

Адзначаючы гэтае свята, мы з падзякай узгадваем нафтавікоў-першапраходцаў, на чый лёс выпалі цяжкасці будаўніцтва, наладкі і станаўлення завода. Упэўнены, наперадзе «Нафтан» чакаюць новыя вяршыні, дасягнуць якіх дапаможа ваш прафесіяналізм, надзейнасць і адказнасць — якасці сапраўдных нафтавікоў. Хай праца прыносіць радасць, а цвёрдасць у дасягненні пастаўленых мэтаў прыводзіць да новых прафесійных перамог!

Зычу нашаму калектыву, калегам з Мазырскага НПЗ безаварыйнай работы, удалага правядзення рэканструкцыі і мадэрнізацыі заводаў. Няхай усё ва ўсіх атрымаецца!

**Генеральны дырэктар ААТ «НАФТАН» Вячаслаў ЯКУШАЎ.**

ISSN 1990 - 763X

